Ларыса Доўнар

# ДАСЛЕДАВАННЕ КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ЗАЎВАГІ

*Асаблівая ўвага звяртаецца на стратэгію і метадалогію даследаванняў, праблемы навуковага адлюстравання стану і перспектыў нацыянальнага кнігавыдання Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі, значэнне навуковых даследаванняў для практыкі кнігавыдання; выдзяляецца роля статыстычнага метада.*

Пры вызначэнні, выбары ці фарміраванні той ці іншай метадалогіі даследавання сучаснай кнігавыдавецкай дзейнасці мае першаснае значэнне стратэгія арганізацыі фактаў кнігавыдавецкіх ведаў (храналогія, марфалогія, генеалогія, тэлеалогія), зафіксаваных у часавай, гістарычнай паслядоўнасці; якім нададзена тая ці іншая сэнсавая форма і структура; якія назіраюцца ў дынаміцы іх паэтапнага развіцця і ва ўзаемасувязі характэрных рысаў; аналізуюцца як мэты, інтэнцыі і матывы дзеянняў, тлумачацца з дапамогай законаў і прычын тых ці іншых з'яў. Успрыняцце і разгляд аб'екта даследавання ў сістэмнай цэласнасці вызначаецца таксама патрэбнасцю пабудовы сістэмна абумоўленай спецыяльнакнігазнаўчай тэорыі кнігавыдавецкіх ведаў [1].

Адлюстраванне прычынна-следчых працэсаў змянення і развіцця кнігавыдання ў сучаснай Беларусі ці ў любой з постсавецкіх краін вымагае іх глыбокага і комплекснага аналізу з выхадам на тлумачэнне тых ці іншых спецыфічных праблем "кнігі і кнігавыдання" на постсавецкай прасторы (напрыклад, неабходна ўлічваць такія "хваробы роста", як перарваныя культурныя дасавецкія традыцыі, савецкая "каланіяльная" спадчына, постсавецкі "правінцыяналізм").

Дастаткова развітыя сістэмы дзяржаўнага, нацыянальнага бібліяграфічнага ўліку і статыстычных даследаванняў у галіне кнігавыдання могуць даць адказ на шэраг актуальных пытанняў і прадставіць даволі поўную карціну стану сучаснага кнігавыдання

ў любой з постсавецкіх краін. Так, да прыкладу, дзякуючы падрыхтаванаму Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі статыстычнаму зборніку "Печать стран СНГ в цифрах, 2012. Статистические данные книжных палат Армении, Беларуси, Казахстана, Молдовы, России, Таджикистана, Украины" (Мінск, 2013) [14] была актуалізавана не толькі магчымасць, але і неабходнасць параўнання стану кніжнага рынка ў асобных краінах на постсавецкай прасторы, выяўлення агульных тэндэнцый і спецыфікі развіцця нацыянальнага кнігавыдання [5]. Выканаўчы дырэктар Асацыяцыі кнігараспаўсюджвальнікаў незалежных дзяржаў Анатолій Уладзіміравіч Гарбуноў, супастаўляючы паказчыкі рынкаў "трёх наиболее активных в издательском отношении стран – России, Украины и Беларуси" адзначыў, што ў асобных краінах – удзельніцах СНД і Садружнасці ў цэлым такога аналізу стану кніжнага рынка да апошняга часу практычна ніхто не праводзіў [3].

Аднак нельга не ўспомніць у даным выпадку і не прывесці ў прыклад першы падобны вопыт на постсавецкай прасторы, адлюстраваны ў выдадзеным зборніку матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць", якая праходзіла 3–4 кастрычніка 1996 г. у Мінску [17] – гэта ў першую чаргу вынікі параўнальнага аналізу кнігавыдання ў Беларусі, Расіі і Украіне, праведзенага Аляксандрам Сяргеявічам Патупам, адным з першых недзяржаўных выдаўцоў у Беларусі [2, с. 352], які заўважыў, што кнігавыданне ў пачатку існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь (у 1991–1995 гг.) стала форвардам рынкавых адносін. Менавіта беларускія прыватныя выдаўцы забяспечылі ў нас "усплёск-93", тады як іх расійскім і ўкраінскім калегам не ўдалося кампенсаваць вельмі рэзкі спад актыўнасці дзяржвыдавецтваў. Калі ў 1995 г. Беларусь па тыражах і колькасці найменняў усё яшчэ некалькі апярэджавала "перадрынкавы ўзровень", то ў Расіі меў месца спад па сумарным тыражы ў 4,7 разы, ва Украіне – у 3,1 разы, па колькасці найменняў – у 1,9 і 1,6 разы адпаведна.

У 1993 г. быў дасягнуты і пік выпуску беларускамоўных выданняў за перыяд існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь (з

1991 г. да сёння) – амаль 27%. У наступныя гады – з 1994 і асабліва з 1996 года, адзначаецца іх спад.

Каб яскравай і відавочнай была карціна сучаснага стану беларускамоўнага кнігавыдання звернемся да параўнальнай статыстыкі і адзначым самыя паспяховыя і высокія паказчыкі беларускамоўнага кнігавыдання і наадварот – самыя нізкія:

| Самыя высокія паказчыкі | | Самыя нізкія паказчыкі | |
|---|---|---|---|
| Гады (па дзесяцігоддзях) | Усяго надрукавана (назваў ад агульнай колькасці выданняў, у %) | Гады (па дзесяцігоддзях) | Усяго надрукавана (назваў ад агульнай колькасці выданняў, у %) |
| 1929 | 72,5 | 1923 | 12,5 |
| 1930 | 88,4 | 1939 | 50,5 |
| 1945 | 87,6 | 1940 | 48,6 |
| 1954 | 58,4 | 1956 | 37,9 |
| 1968 | 30,8 | 1965 | 15,3 |
| 1970 | 25,3 | 1974 | 14,1 |
| 1988 | 13,7 | 1985 | 11,5 |
| 1993 | 26,9 | 1999 | 10,7 |
| 2004 | 11,2 | 2008 | 6,7 |

Такім чынам, у гісторыі беларускага кнігавыдання самыя высокія паказчыкі зафіксаваны ў 1930 г., калі было выпушчана 88,4 % беларускамоўных выданняў ад усёй колькасці кніжнага рэпертуару, а самы нізкі паказчык, які можна параўнаць толькі з перыдам да 1917 г., калі Беларусь была ў складзе Расійскай імперыі, з'явіўся ў 2008 г. – 6,7%.

Паводле даных Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, што адлюстроўваюцца ў штогадовых статыстычных зборніках "Друк Беларусі" [6-10], удзельная вага беларускамоўных выданняў у агульным кнігавыдавецкім патоку сучаснай незалежнай Беларусі за апошнія 5 год крыху стала большай і ў сярэднім складае ўжо 9 %:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Гады | На аднаго жыхара | Усяго выдадзена | | Беларускамоўныя выданні ад усёй выдадзенай кніжнай прадукцыі | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | колькасць назваў | тыраж млн.экз. | назвы, % | тыраж, % |
| 2009 | 5,5 | 12885 | 52,8 | 8,5 | 9,9 |
| 2010 | 4,5 | 11 040 | 43,1 | 8,6 | 9,3 |
| 2011 | 3,6 | 11 084 | 34,3 | 8,5 | 8,4 |
| 2012 | 3,5 | 11 344 | 33,1 | 9,5 | 9,1 |
| 2013 | 3,5 | 11 441 | 31,4 | 10,1% | 12,3 |

Як жа выглядае моўная сітуацыя нацыянальнага кнігавыдання ў іншых краінах былога СССР: у Арменіі, Казахстане, Малдове, Расіі, Таджыкістане, Украіне? Вынікі за 2012–2013 гг. наступныя [15-16][1]:

| Краіна | Колькасць назваў выданняў на нацыянальнай мове | | Колькасць назваў выданняў на рускай мове | | Суадносіны колькасці назваў выданняў на нацыянальнай і на рускай мовах | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2012 | 2013 | 2012 | 2013 | 2012 | 2013 |
| Арменія | 1217 | 1253 | 143 | 102 | у 8,5 раз больш на армянскай мове | у 12,3 разы больш на армянскай мове |
| Казахстан | 2087 | 2449 | 1568 | 1651 | у 1,3 разы больш на казахскай мове | у 1,5 разы больш на казахскай мове |
| Малдова | 1875 | – | 383 | – | у 5 раз больш на румынскай мове | – |
| Таджыкістан | 388 | 498 | 111 | 160 | у 3,5 раз больш на таджыкскай мове | у 3,1 раза больш на таджыкскай мове |
| Украіна | 16342 | 16310 | 7034 | 7198 | у 2,3 разы больш на ўкраінскай мове | у 2,3 разы больш на ўкраінскай мове |
| Беларусь | 1073 | 1153 | 9577 | 9443 | у 9 раз больш на рускай мове | у 8,2 разы больш на рускай мове |

[1] У выданні за 2013 г. адсутнічаюць статыстычныя даныя па Малдове, а таксама няма даных па выпуску кніг і брашур на мовах у Кыргызстане.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадатная дынаміка ў кнігавыданні на нацыянальных мовах назіраецца ў Арменіі і Казахстане; захоўвае стабільнасць, нягледзячы на складаную палітычную сітуацыю – Украіна, а таксама імкнецца ўтрымліваць пазіцыі Таджыкістан. Гэта тыя краіны, дзе выпуск кніг на нацыянальнай мове з'яўляецца як прыярытэтным кірункам, так і форвардам кнігавыдавецкай справы. У 2013 г. у Беларусі ў параўнанні з 2012 г. адзначаецца ледзь заўважны рост колькасці выданняў на беларускай мове і адпаведна – спад выпуску рускамоўных выданняў. Аднак, сітуацыя застаецца катастрафічнай для нацыянальнай кнігі і кнігавыдання. І, як можна бачыць, ніводная краіна СНД не мае падобнай статыстыкі як у Беларусі, што не можа не выклікаць занепакоенасці аб перспектыўным развіцці не толькі нацыянальнага кнігавыдання, але і беларускай мовы, адукацыі, культуры.

Вынікі статыстыкі кнігавыдання ў Беларусі, якія адносна аб'ектыўна адлюстроўваюць стан спраў у галіне, могуць служыць таксама асновай для выбару крытэрыяў перыядызацыі сучаснага кнігавыдання і параўнальнай характарыстыкі яго развіцця на пэўных этапах: у 1991–1996, 1997–2001, 2002–2007, пасля 2008 г. [2; 4] або – у 1991–1995, 1996–2008, пасля 2009 г. [12, с.56-57]. Акрамя таго, што лічбы ўмеюць "гаварыць": аргументаваць і сведчыць, яны, безумоўна, прадстаўляюць толькі вяршыню айсберга і патрабуюць тлумачэння тых ці іншых узаемасувязяў, кірункаў, тэндэнцый, заканамернасцей у кніжнай справе Беларусі.

Некаторыя вынікі вывучэння кніжнага рынку апошняга 20-годдзя адлюстраваны ў працах выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта [12], генеральнага дырэктара фірмы "Макбела", арганізатара і кіраўніка кніжнай выставы-кірмаша "Мир книг", Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмаша "Кнігі Беларусі" Дз. Г. Макарава [14]. Аналізуючы дынаміку, выяўляючы тэндэнцыі характэрных зменаў кнігавыдання ў Беларусі, аўтары грунтуюцца на даных найперш выдавецкай статыстыкі, прымяняюць таксама і эканамічныя метады, якія дазваляюць выявіць няўстойлівасць і цыклічнасць у дынаміцы даных паказчыкаў кнігавыдання. Аўтары выказваюць сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

салідарнасць і аднадумства з меркаваннямі А. С. Патупы адносна першага этапу сучаснага беларускага кнігавыдання ў 1991–1995 гг., адзначаючы яго інтэнсіўнае развіццё. "Калі б тэмпы развіцця нацыянальнага кнігавыдання, якія былі набраныя ў дзевяностыя гады мінулага стагоддзя, падтрымліваліся, то да 2025 году краіна выйшла б на ўзровень 22 750 найменняў кніг і брашур у год. Фактычна Беларусь стала б адным з лідэраў сусветнага кнігавыдання" [12, с. 57]. Аднак вынікі 2009 і 2010 гг. не пацвердзілі такога аптымістычнага прагназавання. Як адзначаюць М. І. Кулак і Н. Э. Трусевіч, разглядаючы перспектывы развіцця кнігавыдання ў Беларусі, Расіі, Украіне, неабходна "аператыўна і ўсебакова аналізаваць асноўныя паказчыкі кнігавыдання, каб адсочваць іх дынаміку і выяўляць тэндэнцыі" і ажыццяўляць на аснове гэтага сістэмныя пераўтварэнні, накіраваныя на павышэнне адаптацыйных магчымасцей кнігавыдавецкай галіны, забеспячэнне яе функцыянавання як самаарганізаванай сістэмы [12, с. 63].

У прыведзеных працах выкарыстоўваюцца параўнальна-аналітычная і прагнастычная метадалогіі, што і вызначае іх на даследчай постсавецкай прасторы [12, с. 58]. Садзейнічала б развіццю як ведаў, так і кнігавыдавецкай практыкі, іх перспектыў, параўнальная характарыстыка беларускага кнігавыдання ў кантэксце развіцця сусветнага кніжнага рынку. Да прыкладу, у галіновым дакладзе "Книжный рынок России. Состояние, тенденции и перспективы развития" (Масква, 2014) такія даныя выкарыстоўваюцца дзякуючы даследаванням сусветнага кніжнага рынку, якія ажыццяўляе кампанія Rüdiger Wischenbart Content and Consulting [18].

Безумоўна, што параўнальны аналіз вымагае прывядзення ў адпаведнасць і тэрмінасістэмы кнігавыдавецкіх ведаў, якія адлюстроўваюць, да прыкладу, тыпалагічную структуру сістэмы кнігавыдавецкай справы ў краіне. Аднак, што да такога тэрміна, як "кніжны рынак" і самой данай сферы дзейнасці ў Беларусі, то яны не маюць дастаткова глыбокага і шырокага асвятлення, з'яўляючыся, на наш погляд, пэўным "табу" для падрабязнага навуковага аналіза, складаючы прыярытэт і, у некаторай ступені, безальтэрнатыўнасць афіцыйнага бачання справы [13].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыцы кнігавыдання сёння патрэбна сур'ёзная дзяржаўная праграма дзеянняў і пераўтварэнняў, якая грунтавалася б у тым ліку і на афіцыйным, але "незамаскіраваным" статыстыка-аналітычным аглядзе дзейнасці ў галіне кніжнай справы, да стварэння якога прыцягваліся б і навукоўцы, праводзіліся спецыяльныя сацыялагічныя даследаванні і маніторынгі. Не зашкодзіў бы, да прыкладу, вопыт Украіны па выданні навуковага часопіса "Вісник Книжкової палати". Пакуль жа толькі асобныя працы прадстаўляюць сучасны стан беларускага кнігавыдання, парушаючы навуковае зацішша, служаць індыкатарам і нават дэтанатарам у сферы даследаванняў, як кніжнага рынка [11-12; 14], так і кніжнай культуры Беларусі [2; 4; 5].

Шматаспектнае вывучэнне дакументнага патоку сучаснага кнігавыдання (яго бібліяметрычны аналіз) складае адзін з важнейшых кампанентаў даследаванняў і па кніжнай культуры, перад якой паўстаюць задачы, звязаныя з забеспячэннем культурнай пераемнасці нацыянальнай спадчыны ў дэмакратычным, мультыкультурным і шматнацыянальным соцыуме, патрабуючы інавацыйных падыходаў, заснаваных на метадалогіі кампаратыўных даследаванняў.

Аднак пакуль пераважае, у некаторай ступені нават правакацыйны, статыстычны метад, які, тым не менш, пашырае даследчае поле сучаснага кнігавыдання ў Беларусі, пераадольвае інфармацыйнае адчужэнне, дазваляе прагназаваць перспектывы кнігавыдавецкай дзейнасці, якая павінна разумецца не толькі як бізнэс, а перш за ўсё як важнейшы сродак асветы і гуманізму!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Беловицкая, А. А.* Система книговедческого метода / А. А. Беловицкая // Книга в информационном обществе : материалы XIII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения (Москва, 28–30 апр. 2014 г.) : в 4 ч. / отв. ред. В. И. Васильев ; сост. Д. Н. Бакун, М. А. Ермолаева. – Москва : ФГБУ науки НИЦ "Наука" РАН, 2014. – Ч. 1. – С. 444.

2. Выпрабаванне сучаснасцю: кніга незалежнай Беларусі (1991–2010) / [Л. І. Доўнар] // Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / М. В. Нікалаеў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.). – С. 339–381.

3. *Горбунов, А. В.* Книжный рынок России, Украины и Беларуси сегодня / Анатолий Владимирович Горбунов // Университетская книга [Электронный ресурс]. – 2014. – Май. – Режим доступа: http://www.unkniga.ru/bookrinok/knigniy-rinok/3043-knizhniy-rynok-rossii-ukrainy-i-belarusi.html.–Дата доступа: 21.05.2014.

4. *Доўнар, Л. І.* Кніга незалежнай Беларусі / Л. І. Доўнар // Гісторыя беларускай кнігі / Л. І. Доўнар. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 170–198.

5. *Доўнар, Л. І.* Сутнаснае прызначэнне кнігі і мовы як з'яў культуры: ад замацаванай інфармацыі да трансляцыі і пераемнасці ведаў / Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: вывучэнне і захаван-не : зб. навук. арт. – Мінск : БДУКМ, 2012 – [Вып. 4]. – С. 32–48.

6. Друк Беларусі, 2009 : статыстычны зборнік / Міністэр-ства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка. – Мінск : НКП Беларусі, 2010. – 92 с.

7. Друк Беларусі, 2010 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка. – Мінск : НКП Беларусі, 2011. – 80 с.

8. Друк Беларусі, 2011 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка. – Мінск : НКП Беларусі, 2012. – 72 с.

9. Друк Беларусі, 2012 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка ; пад агул. рэд. А. В. Івановай. – Мінск : НКП Беларусі, 2013. – 76 с.

10. Друк Беларусі, 2013 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. В. Сяргеенка ; [рэд. Т. Р. Рабушка] ; пад агул. рэд. А. В. Івановай. – Мінск : НКП Беларусі, 2014. – 76 с.

11. *Иванова, Е. В.* Тенденции развития книгоиздания Беларуси (по итогам статистики печати 2009–2010 гг.) / Е. В. Иванова // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / склад.: Л.И. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мінск : БДУКМ, 2011. – Вып. 3. – С. 303.

12. *Кулак, М. И.* Современное состояние и прогноз развития книгоиздания Беларуси, России, Украины / М. И. Кулак, Н. Э. Трусевич // Труды Белорусского государственного технологического университета. – 2012. – №9. – С. 56-63.

13. *Лапцёнак, І. М.* Год кнігі: дасягненні і праблемы / І. М. Лапцёнак // Беларуская думка. – 2013. – № 1. – С. 46-49.

14. *Макаров, Д. Г.* Развитие книжного рынка Республики Беларусь, 1991–2011: статистика в динамике развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.publisher.by/bookmarketrb1/ – Дата доступа: : 21.05.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ